# § 8. Міжасобасныя адносіны

## Дзе ёсць гвалт — няма сяброўства і кахання?




Узроўні міжасобасных адносін

**Віды міжасобасных адносін.** На працягу ўсяго жыцця кожны чалавек выстройвае адносіны з іншымі людзьмі. Можна сказаць, што першасным узроўнем міжасобасных адносін з'яўляецца простае *знаёмства*. Да знаёмых належаць усе людзі, якіх вы ведаеце асабіста. Гэта максімальна шырокае кола людзей, з якімі ўзнікаюць міжасобасныя адносіны.

Наступным узроўнем можна назваць *прыяцельства*. У адрозненне ад проста знаёмых паміж людзьмі, якія знаходзяцца ў стане прыяцельства, існуюць узаемная сімпатыя, жаданне кантактаваць, разам бавіць вольны час. Асаблівым відам міжасобасных адносін з'яўляецца *таварыства*, заснаванае на сумеснай дзейнасці і дасягненні агульных мэт. *Сяброўства* грунтуецца на высокай ступені даверу людзей адно аднаму, узаемнай сімпатыі і бескарыслівых матывах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Каханне*** **— гэта найвышэйшы ўзровень развіцця міжасобасных адносін, пачуццё глыбокай прыхільнасці і скіраванасці да іншага чалавека, пачуццё глыбокай сімпатыі. На працягу ўсёй чалавечай гісторыі каханне з'яўляецца адной з асноўных тэм у філасофіі, літаратуры, тэатры і кіно.**

Большасць людзей марыць спаткаць у сваім жыцці сапраўднае каханне. Што значыць «я кахаю»? ■

Лічыцца, што пра каханне ўсё сказалі яшчэ старажытныя грэкі, якія выкарыстоўвалі для гэтага сем паняццяў:



*Ян Матэйка.*
*Жыгімонт Аўгуст з Барбарай*

- эрас — гарачае каханне-захапленне, якое імкнецца да фізічнай блізкасці;
- людус — каханне-гульня, якое не вылучаецца глыбінёй пачуцця, арыентавана на задавальненне, даволі лёгка дапускае магчымасць здрады;
- сторге — спакойнае, цёплае і надзейнае каханне-сяброўства, каханне-пяшчота;
- прагма — разважлівае каханне, якое лёгка паддаецца свядомаму кантролю, каханне па разліку;
- манія — каханне-апантанасць, для якога характэрна залежнасць ад аб'екта цягі;
- агапэ — бескарыслівая самаахвярнасць (напрыклад, любоў да блізкага);
- філія — любоў паміж бацькамі і дзецьмі.

Ці актуальныя ўяўленні старажытных грэкаў сёння? ■

Якая легенда Нясвіжскага замка звязана з гісторыяй кахання Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл? Назавіце вядомыя вам мастацкія творы (літаратурныя, музычныя), у якіх паказаны вобразы закаханых Барбары і Жыгімонта. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Каханне часта суадносіцца з высокім рамантычным ідэалам духоўнай і пачуццёвай блізкасці. Пры гэтым каханне настолькі ідэалізуецца, што ў скептыкаў узнікаюць сумненні ў тым, ці існуе яно ў штодзённым жыцці.

**Што такое каханне?**

Love is... — вядомы комікс, які існуе з 1970-х гг. да цяперашняга часу. Малюнкі розных праяў узаемаадносін хлопчыка і дзяўчынкі з кароткім гумарыстычным азначэннем кахання сталі вельмі папулярныя.

Даведайцеся, якая рэальная гісторыя кахання ляжыць у аснове комікса. ■



Ці магчыма даць адзінае азначэнне каханню? Прапануйце свой працяг фразы: «Каханне — гэта...» Чым адрозніваецца каханне ад закаханасці? ■

Ад чаго залежыць, якія ў нас складуцца адносіны з іншым чалавекам? Застанёмся мы проста знаёмымі або зробімся сябрамі, будзем варагаваць або пакахаем адно аднаго? Міжасобасныя адносіны шмат у чым залежаць ад нашага ўспрымання іншага чалавека. Колькі разоў наша першае ўражанне пра іншага чалавека адпавядала тым адносінам, якія складваліся з ім далей?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Успрыманне людзьмі адно аднаго

| | |
|---|---|
| **Эфект арэолу** | Паводзіны іншых людзей ацэньваюцца на падставе вобраза, які склаўся раней. Першае спрыяльнае ўражанне прыводзіць да пазітыўнай ацэнкі яшчэ не вядомых якасцей чалавека, і наадварот, агульнае неспрыяльнае ўражанне правакуе перавагу негатыўных ацэнак |
| **Эфекты першаснасці і навізны** | Пры ўспрыманні незнаёмага чалавека пераважае першая вядомая інфармацыя пра яго (эфект першаснасці), а пры ўспрыманні знаёмага чалавека найбольш значнай аказваецца апошняя інфармацыя пра яго (эфект навізны) |
| **Эфект праекцыі** | Людзі прыпісваюць іншым тыя якасці, эмоцыі і перажыванні, якія ёсць у іх саміх. Прыемнаму суразмоўцу чалавек прыпісвае свае вартасці, а непрыемнаму — свае недахопы |

Успрымаючы іншага чалавека, мы часта кіруемся стэрэатыпамі — звыклымі для нас поглядамі. **Стэрэатып** (ад стар.-грэч. *στερεός* «цвёрды» + *τύπος* «адбітак») — устойлівыя і спрошчаныя ацэначныя ўяўленні пра групу людзей (пэўнага полу, расы, этнічнай прыналежнасці, веравызнання, узросту, прафесіі і інш.) і адпаведнае стаўленне да гэтай групы і сітуацый, з імі звязаных. Стэрэатыпы фарміруюцца не столькі як вынік нашага асабістага досведу, а ў першую чаргу як вынік уздзеяння ўжо сфарміраваных уяўленняў, грамадскай думкі, замацаванай у кнігах, кінафільмах.

Паняцце «стэрэатып» у 1922 г. увёў у навуковы ўжытак амерыканскі вучоны і пісьменнік Уолтэр Ліпман. ■

Навуковец вылучыў наступныя ўласцівасці стэрэатыпаў: схематычнасць і спрошчанасць — стэрэатыпы толькі часткова адлюстроўваюць рэальнасць; памылковасць — стэрэатыпы скажаюць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

разгляданы аб’ект; шырокае распаўсюджанне — стэрэатыпы рэдка аднаўляюцца адным чалавекам; устойлівасць і працягласць — для змены або разбурэння стэрэатыпа неабходны час. Навуковец звяртаў увагу на тое, што стэрэатып пачынае дзейнічаць яшчэ да таго, як уключаецца розум чалавека. Менавіта таму стэрэатып часта адносяць да забабонаў.

## Схема стэрэатыпа

| Успрыманне | Ацэнка | Эмоцыя | Дзеянне |
|---|---|---|---|
| Што менавіта мы заўважаем у іншым чалавеку | Як мы ацэньваем тое, што заўважылі | Як мы перажываем тое, што ацэньваем | Што мы ў выніку робім або перажываем |

Працягніце, не задумваючыся, наступныя фразы. З дапамогай схемы патлумачце, як працуюць гэтыя стэрэатыпы.

- Усе бландзінкі...
- Мужчыны ніколі не...
- Пажылыя людзі заўсёды... ■

Стэрэатыпы, калі да іх не ставіцца крытычна, прыводзяць да спрошчанага ці нават скажонага разумення іншага чалавека, да ўзнікнення прадузятасцей і нават дыскрымінацыі. Напрыклад, калі вы адмовіліся ехаць у таксі, таму што за рулём знаходзіцца жанчына, то гэта праява прадузятасці і несправядлівасці. Варта заўважыць, што дадзены стэрэатып не пацвярджаецца статыстыкай дарожна-транспартных здарэнняў. Існаванне стэрэатыпаў шмат у чым падтрымліваецца дзякуючы СМІ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Ці спрыяюць медыя стэрэатыпізацыі ўспрымання людзей?**





Правядзіце пошук у інтэрнэце на запыт «уборка». Якія малюнкі будуць пераважаць у выніках — мужчынскія або жаночыя? Чым гэта можна растлумачыць? ■

Задумаемся, ці будуць паспяховымі адносіны з іншымі людзьмі, калі ў выбары таварышаў для важнай справы, сяброў ці каханага чалавека кіравацца стэрэатыпамі.

**Узаемадзеянне людзей у малых групах.** Акрамя міжасобасных стасункаў, якія маюць на ўвазе зносіны двух людзей, значную частку часу мы праводзім ва ўзаемадзеянні ў малых групах. Як правіла, да такіх груп адносяць сям'ю, школьны клас, кампанію сяброў. *Малую групу* можна вызначыць як нешматлікую па складзе, яе ўдзельнікі аб'яднаны агульнай дзейнасцю і знаходзяцца ў непасрэдных асабістых зносінах, што з'яўляецца асновай для ўзнікнення эмацыйных адносін, групавых нормаў і групавых працэсаў. Асноўным крытэрыем для таго, каб аднесці тую ці іншую групу да малой, з'яўляецца магчымасць непасрэдных асабістых зносін удзельнікаў групы паміж сабой.

Па характары арганізацыі групы дзеляцца на фармальныя і нефармальныя. У *фармальнай* групе пераважае знешняя арганізацыя (усталяваная звонку). Як правіла, фармальныя групы існуюць як частка больш буйной арганізацыі. Прызначаны кіраўнік выступае як пасрэднік паміж групай і больш высокім кіраўніцтвам, якое рэгулюе стасункі і мэты дзейнасці. У якасці фармальнай групы можа выступаць, напрыклад, школьны клас або працоўны калектыў аддзела ў буйной арганізацыі. *Нефармальная*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

група вылучаецца перавагай унутранай арганізацыі. Такія групы ўзнікаюць стыхійна. У іерархіі нефармальнай групы існуюць: лідар; атачэнне лідара; асобы, якія прызнаюць лідара, але знаходзяцца за межамі яго атачэння, а таксама аўтсайдары.

Прыналежнасць да групы звязана з прыняццем нормаў і ўзораў паводзінаў, якія пераймаюць усе ўдзельнікі гэтай групы. Часам для ўваходжання ў малую групу чалавеку неабходна пэўным чынам скарэкціраваць свае паводзіны. Аднак не ва ўсіх выпадках групавыя нормы і каштоўнасці адпавядаюць перакананню чалавека.

**Калектывізм**

Згода з пазіцыяй групы ў выніку ўсвядомленага супадзення памкненняў асобы з мэтамі групы, свядомае служэнне калектыўным інтарэсам

**Індывідуалізм**

Прызнанне прыярытэту асобасных мэт і інтарэсаў перад калектыўнымі

**Канфармізм**

Прыстасаванне чалавека да прынятых групавых нормаў паводзінаў і дзейнасці пад уплывам рэальнага або ўяўнага ціску з боку іншага чалавека ці групы ў цэлым

**Нонканфармізм**

Імкненне адстойваць установкі, перакананні, якія супярэчаць тым, што пануюць у гэтай групе або грамадстве

Ці можна лічыць адмаўленне ўсіх групавых нормаў праявай сапраўднай незалежнасці, самастойнасці асобы? ■

Як відаць, групы адрозніваюцца рознымі нормамі і правіламі паводзінаў. Ёсць групы, у якіх склаліся спакойныя і сяброўскія адносіны паміж вельмі рознымі ўдзельнікамі, а ёсць групы, дзе існуе цкаванне, або *булінг* (ад англ. *bullying* — запалохванне) — сістэматычнае прыніжэнне, знявага, выключэнне са стасункаў, псіхалагічнае і фізічнае ўздзеянне на чалавека групай асоб. Для булінгу характэрны наступныя прыметы: сістэматычнасць, наўмыснасць, паўтаральнасць гвалту, няроўнасць сіл. Важна



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**разумець, што калі з чалавекам не вітаюцца, адмаўляюцца сядзець побач, адбіраюць, хаваюць і псуюць яго рэчы, то гэта здзек, а не жарт або гульня.**

Чаму булінг — гэта хвароба ўсёй групы, а не праблема асобнага чалавека? ■

У групе ёсць агрэсары, якія пераследуюць, ёсць пацярпелыя, якіх крыўдзяць, і ёсць маўклівая большасць — назіральнікі, гледачы, якія дазваляюць усяму гэтаму адбывацца, баючыся трапіць на месца ахвяры. Ахвярай можа стаць любы: не важна, дужы ці слабы фізічна або псіхалагічна. Агрэсар ў булінгу — той, каму неабходна самасцвердзіцца за кошт іншых.

Цкаванне нельга спыніць аднаму, важна не маўчаць, звяртацца па дапамогу.




Напішыце пяць правілаў зносін у класе, якія вы лічыце важнымі для прадухілення булінгу. Абмяркуйце з аднакласнікамі атрыманыя спісы. Стварыце рэйтынг правілаў, размясціўшы іх ад самага папулярнага да найменш папулярнага. Дамоўцеся пра выкананне складзеных правілаў. ■

**Лідарства. Лідарства — гэта здольнасць чалавека ўплываць на іншых людзей, каб знайсці падтрымку для далейшага дасягнення мэт. Лідарства з'яўляецца адным з найважнейшых пытанняў арганізацыі групавога ўзаемадзеяння. Пры гэтым трэба адрозніваць паняцці «лідар групы» і «кіраўнік групы».**

***Лідар* — гэта аўтарытэтны ўдзельнік малой групы, асобасны ўплыў якога дазваляе яму адыгрываць галоўную ролю ў прыняцці групавых рашэнняў і ажыццяўленні сумеснай дзейнасці. Вылучэнне лідара — гэта стыхійны (неарганізаваны) працэс. У адрозненне ад лідара *кіраўнік* — гэта асоба, на якую афіцыйна ўскладаюцца функцыі кіравання групай і арганізацыя яе дзейнасці.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Кіраўнік**

- Рэгулюе афіцыйныя адносіны
- Прызначаецца або абіраецца ў адпаведнасці з працэдурай
- Валодае больш стабільным становішчам і ў большай меры залежыць ад вышэйшага кіраўніцтва
- Прыняцце рашэнняў у многім абумоўлена задачамі, якія стаяць перад арганізацыяй
- Сфера дзейнасці шырэйшая, паколькі кіраўнік з'яўляецца прадстаўніком малой групы ў большай арганізацыі



**Лідар**

- Рэгулюе міжасобасныя адносіны
- Вылучаецца стыхійна
- Валодае менш стабільным становішчам і ў значнай меры залежыць ад настрою групы
- Непасрэдна прымае рашэнні, якія тычацца групавой дзейнасці
- Сфера дзейнасці — у асноўным малая група

Безумоўна, найбольш спрыяльнай з'яўляецца сітуацыя, калі лідар і кіраўнік — гэта адзін чалавек. Аднак на практыцы часта здараецца так, што фармальны кіраўнік не карыстаецца аўтарытэтам. У гэткіх сітуацыях роля нефармальнага лідара пераходзіць да іншага ўдзельніка групы. Больш за тое, у розных сітуацыях у якасці лідара могуць вылучацца розныя людзі. Напрыклад, у школьным класе пры арганізацыі турыстычнага паходу лідарства возьме на сябе адзін вучань, а пры правядзенні дабрачыннай акцыі — другі.

Эфектыўнасць лідара шмат у чым абумоўлена характарам дзейнасці групы, складам удзельнікаў (іх кампетэнтнасцю, здольнасцю працаваць у камандзе), а таксама тымі прыёмамі і метадамі, якія ён выкарыстоўвае для выканання сваіх функцый. Сукупнасць гэтых прыёмаў і метадаў вызначаюць *стыль лідарства*. Вылучаюць тры асноўныя стылі лідарства: дырэктыўны, калегіяльны, ліберальны.

*Дырэктыўны стыль* характарызуецца жорсткасцю, патрабавальнасцю, адзінаўладдзем, перавагай уладных функцый, строгім



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кантролем і дысцыплінай, арыентацыяй на вынік, ігнараваннем сацыяльна-псіхалагічных фактараў. *Калегіяльны стыль* абапіраецца на давер, інфармаванне, творчасць, самадысцыпліну, свядомасць, адказнасць, заахвочванне, галоснасць, калектыўнае абмеркаванне і прыманне рашэнняў. *Ліберальны стыль* вылучаецца поўным даверам і перадачай функцый падначаленым, невысокай патрабавальнасцю. Можа быць выніковым, калі група характарызуецца высокай згуртаванасцю і адказнасцю. Варта адзначыць, што нельга ацэньваць той ці іншы стыль лідарства як добры ці дрэнны. Адзін і той жа стыль лідарства можа быць эфектыўны ў адной сітуацыі і неэфектыўны ў другой.

?

1. Канкрэтызуйце прыкладамі розныя ўзроўні міжасобасных адносін. Выкарыстайце ўводную інфаграфіку.
2. У якой з прапанаваных сітуацый гаворка ідзе пра булінг?
   - На перапынку некалькі юнакоў перакідваюць адзін аднаму сумку свайго аднакласніка, які імкнецца яе адабраць. Пасля званка ўсе разам, весела смеючыся і размаўляючы, адпраўляюцца на заняткі.
   - У кампаніі смяюцца з няўдалай фатаграфіі свайго аднакласніка ў сацыяльнай сетцы і пакідаюць пад ёй крыўдныя каментарыі.
3. Прывядзіце прыклады несправядлівасці з-за дзеяння ўзроставых і прафесійных стэрэатыпаў. Як пазбегнуць прадузятага стаўлення да сябе, іншых людзей?
4. Апішыце міжасобасныя адносіны і стыль лідарства ў тых групах, удзельнікам якіх вы з’яўляецеся. ■

Выканайце міні-праект «Мужчыны і жанчыны ў медыя». Прааналізуйце мужчынскія і жаночыя вобразы ў часопісах і газетах, на тэлебачанні, у кіно. Зрабіце падборку візуальных матэрыялаў. Выкарыстоўвайце памятку для выяўлення стэрэатыпаў пра жанчын і мужчын у медыя. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне